# З РАЗЛІКАМ НА МАКСІМАЛЬНУЮ АДДАЧУ

**Кіраўнік дзяржавы правёў нараду па пытаннях стварэння рэспубліканскай сістэмы маніторынгу грамадскай бяспекі.**

Па практыцы, якая даўно ўжо склалася ў нашай краіне, асабліва важныя дакументы, якія трэба будзе рэалізоўваць, разглядаюцца ў Прэзідэнта. Учора беларускаму лідару быў прадстаўлены на разгляд праект указа па стварэнні сістэмы маніторынгу грамадскай бяспекі.

— Падобныя сістэмы дзейнічаюць у многіх дзяржавах, дзе ўжо паказалі сваю эфектыўнасць. Відавочна, што ў нас укараненне аўтаматызаваных працэсаў выяўлення розных падзей, якія нясуць пагрозу, аналізу той інфармацыі, якая паступае, дазволіць значна павысіць узровень правапарадку, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Акрамя таго, гэта дасць магчымасць вызваліць значную колькасць работнікаў, рэсурсаў, занятых у адпаведных сферах. Гэта значыць аптымізаваць структуры канкрэтных дзяржаўных органаў, чым мы ў цяперашні час актыўна займаемся.

У той жа час ёсць шэраг пытанняў, якія Прэзідэнт і хацеў абмеркаваць дэталёва, перш чым прымаць рашэнні па ўказе.

— У нас ужо ёсць дзейная сістэма відэаназірання, ёсць тэлекамунікацыйныя сеткі і ёсць адпаведнае абсталяванне. Паўстае пытанне: чаго канкрэтна ў гэтай сістэме не хапае? Якія дадатковыя магчымасці мы атрымаем з уводам у строй новай сістэмы? Чаму б даную сістэму не ствараць пад эгідай дзяржаўнага органа, які і стане ўладальнікам адпаведнага інфармацыйнага рэсурсу? Я не думаю (а можа, вы прадставіце дадатковыя аргументы на карысць сваёй прапановы), што ўсё гэта трэба засяродзіць у руках прыватнага аператара.

Кіраўнік краіны пацікавіўся і тым, якія сродкі могуць спатрэбіцца для ўкаранення дадзенай сістэмы:

— Калі не хапае нейкіх сродкаў, трэба сказаць, што гэта за сродкі і колькі такіх сродкаў неабходна. Але падобную сістэму, якая існуе ў нас, неабходна не проста мадэрнізаваць, яе трэба давесці да сучаснага ўзроўню, каб мы маглі атрымаць з яе максімальную аддачу. Апошнія падзеі якраз сведчаць пра тое, што нам бы спатрэбілася такая сістэма і зусім нядрэнна мець яе ў Беларусі.

**У ТЭМУ**

**Ігар ШУНЕВІЧ, міністр унутраных спраў:**

— Кіраўнік дзяржавы прыняў нашу прапанову аб тым, што такая сістэма дарэчная і неабходная ў любой цывілізаванай дзяржаве, і даручыў дадаткова прапрацаваць шэраг аспектаў, звязаных з практычнай рэалізацыяй праекта. У першую чаргу гэта, вядома ж, пытанні, звязаныя з выбарам аператара, які будзе генерыраваць усе ідэі і ажыццяўляць практычную рэалізацыю, пачынаючы ад куплі «жалеза» і заканчваючы эксплуатацыяй. Мы атрымалі адпаведныя ўказанні і будзем дапрацоўваць гэты праект указа менавіта з пункту гледжання прыўнясення нацыянальных асаблівасцяў і магчымасцяў нашай дзяржавы для рэалізацыі гэтага праекта.

## На мове дыпламатыі

# Давайце будзем паслядоўнымі ў ацэнках

**Міністэрства замежных спраў Беларусі пракаменціравала інфармацыю, што з'явілася ў прэсе, аб рэакцыі еўрапейскіх інстытутаў, некаторых краін ЕС і асобных заходніх палітыкаў на падзеі 25 сакавіка. Адпаведныя заявы зрабіў прэс-сакратар МЗС Дзмітрый МІРОНЧЫК, паведамляе БЕЛТА.**

«Перш за ўсё хачу адзначыць, што правы грамадзян на мірныя сходы і свабоднае выказванне меркавання замацавана ў Канстытуцыі нашай краіны. Аднак ключавое слова тут — мірныя. Калі ж да месца мерапрыемства падвозяць «кактэйлі Молатава», падганяюць аўтамабілі са зброяй, падключаюць анархістаў, то назваць такую акцыю мірнай язык не паварочваецца. Гэта першае», — сказаў прэс-сакратар.

Другое, прадоўжыў ён, ва ўмовах нарастання і пашырэння геаграфіі тэрарыстычнай пагрозы уладам важна быць асабліва пільнымі, дзейнічаць на папярэджанне, а не «разграбаць» наступствы. «Менавіта такі ўрок мы атрымалі з нядаўніх тэрарыстычных актаў у Лондане, Берліне, Парыжы, Брусэлі, Ніцы. Менавіта гэтым кіраваліся беларускія ўлады 25 сакавіка. Галоўнай задачай было гарантаваць бяспеку грамадзян і не дапусціць кровапраліцця, асабліва з улікам наяўнай інфармацыі аб правакацыях, якія рыхтаваліся», — падкрэсліў Дзмітрый Мірончык.

«І трэцяе. Акцыя мела несанкцыянаваны характар. Удзел у несанкцыянаваных акцыях вядзе да канкрэтных наступстваў у любой краіне свету. І што «нееўрапейскага» змаглі разгледзець у дзеяннях нашых праваахоўных органаў заходнія палітыкі? У Мінску разганялі дэманстрантаў вадамётамі? Можа, распылялі газ? Не. І дзякуй богу», — сказаў афіцыйны прадстаўнік МЗС.

Паводле слоў прэс-сакратара, дзеянні праваахоўных структур былі абсалютна адэкватнымі. «І калі быць паслядоўнымі, то тады еўрапейскім інстытутам і палітыкам трэба выказваць «занепакоенасць» і шматлікімі затрыманнямі напярэдадні святкавання юбілею Рымскага дагавора 25 сакавіка, актыўным выкарыстаннем пры разгоне дэманстрацый у еўрапейскіх сталіцах вадамётаў, газу і іншых спецсродкаў. Але, напэўна, прасцей па прывычцы «пад мікраскопам» разглядаць Беларусь. І не заўважаць пры гэтым, што санкцыянаваныя акцыі ў шэрагу гарадоў нашай краіны ў той жа дзень прайшлі без якіх-небудзь інцыдэнтаў», — заявіў ён.

«Лічым неабходным працягваць дыялог і ўзаемадзеянне з нашымі замежнымі партнёрамі ў мэтах лепшага разумення пазіцый адно аднаго», — дадаў Дзмітрый Мірончык.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### WP: новае спецпадраздзяленне будзе створана ў Адміністрацыі ЗША



Упраўленне ўзначаліць старшы дарадца прэзідэнта і яго зяць 36-гадовы Джарэд Кушнер.

Паводле інфармацыі газеты The Washington Post, так званае Упраўленне амерыканскай інавацыі Белага дома стане функцыянаваць як самастойнае падраздзяленне. Мяркуецца, што гэтая структура стане свайго роду аператыўнай групай, якая будзе складацца з былых кіраўнікоў камерцыйных арганізацый і якая заклікана «прыўнесці свежае мысленне» ў Вашынгтоне. Акрамя таго, паводле даных газеты, падраздзяленню ў перспектыве перададуць шэраг урадавых функцый.

### Ле Пен абвергла фінансаванне «Нацфронту» з Расіі

Кандыдат у прэзідэнты Францыі скардзіцца, што ёй не ўдаецца атрымаць грошы на выбарчую кампанію ад французскіх банкаў.

У сувязі з гэтым, падкрэсліла Марын Ле Пен, «Нацыянальны фронт» вымушаны шукаць крыніцы фінансавання ў замежных банкаўскіх установах. «Інакш ніяк: прабачце, мне не даюць браць крэдыты ў французскіх банках», — сказала Ле Пен.

24 сакавіка яна здзейсніла візіт у Маскву, дзе яе прыняў у Крамлі прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін. Як паведаміў па выніках гэтай гутаркі прэс-сакратар расійскага кіраўніка Дзмітрый Пяскоў, пытанне фінансавання перадвыбарнай кампаніі лідара «Нацыянальнага фронту» расійскімі банкамі падчас гэтай сустрэчы не абмяркоўвалася. «Я не думаю, што фінансаванне з боку Расіі магчыма», — заявіў журналістам Пяскоў.

### На Зямлі пачалася незвычайная магнітная бура

Вучоныя зафіксавалі пачатак на Зямлі незвычайнай магнітнай буры. Яе асаблівасць у тым, што яна адбываецца ў адсутнасць сонечных плям і сонечнага ветру і выклікана экватарыяльнай вертыкальнай каранальнай дзіркай на Сонцы (вобласць у сонечнай кароне, дзе паніжаны шчыльнасць і тэмпература плазмы).



Пра гэта паведаміў ТАСС кіраўнік Цэнтра касмічнага надвор'я Інстытута зямнога магнетызму, іанасферы і распаўсюджвання радыёхваляў імя М. В. Пушкова Расійскай акадэміі навук Сяргей Гайдашоў.

Назіранні паказваюць, што магнітная бура завяршыцца 28 сакавіка, калі каранальныя дзірка і Зямля ўжо не будуць знаходзіцца на адной прамой. Пры гэтым Сяргей Гайдашоў прагназуе яшчэ адну буру 29—30 сакавіка, бо ў гэты час у бок Зямлі будзе накіравана яшчэ адна каранальная дзірка, узровень яе інтэнсіўнасці пакуль невядомы.

## Блізкая ўлада

# Выслухалі ўсіх

**Каля дваццаці чалавек падчас прамой лініі звярнуліся да кіраўніка Віцебскага аблвыканкама**



Фота Алесі СПАТКАЙ.

Адну заяўніцу **Мікалай ШАРСТНЁЎ** выслухваў прыблізна 30 хвілін. Жанчына доўга расказвала пра зямлю, збудаванні, якія разбураюцца на ёй... Пералічвала інстанцыі, куды звярталася, цытавала адказы. Як высветлілася, «тэматычныя спрэчкі», у першую чаргу з суседзямі, цягнуцца вельмі даўно... Напэўна, пра такіх, як яна, можна смела сказаць «прафесійная скаржніца»? Але і з імі ўлада павінна кантактаваць. Адказныя асобы абавязаны зразумець незадаволенне, каб знайсці шлях канчатковага выхаду з канфліктнай сітуацыі. Так будзе і ў гэтым выпадку.

За тры гадзіны губернатар пачуў і важныя, на яго погляд, «сігналы».

У прыватнасці, улады прааналізуюць практыку збору малака ў насельніцтва. Праблему агучыла жыхарка Аршанскага раёна, якая трымае карову.

На асабістым кантролі будуць і званкі з Віцебска наконт паляпшэння жыллёвых умоў. Найбольш вострая гэтая праблема — для шматдзетных сем'яў.

Пад асаблівай увагай будзе і праблема з выплатай запазычанасці па зарплаце былым работнікам прадпрыемства-банкрута «КІМ». Агульная сума доўгу — каля 6 мільярдаў недэнамінаваных рублёў.

Пачуўшы скаргу з Віцебскага раёна наконт даху, які працякае, Мікалай Шарстнёў падкрэсліў, што прадстаўнікі сістэмы ЖКГ і будаўнікам трэба несці персанальную адказнасць за брак. Гэта тычыцца і няўважлівасці пры разглядзе зваротаў.

Адзін са зваротаў быў вельмі асабістым і эмацыянальным. Жанчына з Віцебска расказала пра 22-гадовую дачку, якая пазнаёмілася з «сектантам». Мужчына, паводле слоў заяўніцы, аказвае псіхічнае ўздзеянне на дзяўчыну.

Апошні зварот выклікаў міжвольную ўсмешку. Бабуля з Віцебскага раёна пацікавілася, чаму трэба плаціць падатак на сабак. Мясцовыя органы ўлады маюць права папаўняць бюджэт законнымі спосабамі. У тым ліку і такой фінансавай «крыніцай». Агучанае пытанне, на думку губернатара, «барометр» недапрацоўкі з боку сельсках выканкама.

— Наогул, «сярэдняе звяно» ўлады яшчэ недастаткова эфектыўна працуе з людзьмі. Асабліва — у глыбінцы, дзе, на жаль, колькасць насельніцтва паменшаецца, — канстатаваў Мікалай Шарстнёў.

Па выніках мінулай прамой лініі з губернатарам пераважную большасць — 19 з 24 — даручэнняў выканалі. Астатнія — на кантролі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

# Дапамагчы, параіць, растлумачыць

**Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір Даманеўскі вырашаў набалелыя пытанні людзей**



Самым актуальным застаецца працаўладкаванне. З двух з паловай дзясяткаў тэлефонных званкоў 7 былі менавіта на гэтую тэму. Найбольш уразлівая катэгорыя насельніцтва — гэта тыя, каму каля 50 і больш. Людміла Міхайлаўна з Хоцімска 26 гадоў займала пасаду загадчыцы ФАПа, а калі ён закрыўся, 4 месяцы працавала ў раённай бальніцы па дагаворы, потым яе скарацілі. Сказалі, што трэба маладым дарогу саступаць. Але Людміле яшчэ 49 гадоў, і ёй таксама трэба дзесьці працаваць. Губернатар не абнадзеіў, параіў падысці ў райвыканкам, дзе ёй прапануюць вакансіі для працаўладкавання.

Сяргей Уладзіміравіч з Клічава будаўнік па прафесіі, але з ім не працягнулі кантракт. Было дзіўна чуць, што чалавек з такой прафесіяй застаўся без справы ў той час, калі ў Клічаве вядуцца маштабныя работы па падрыхтоўцы горада да абласных «Дажынак». Яму было прапанавана адразу ж, не адкладваючы справу ў доўгую скрыню, ісці ў райвыканкам на прыём да старшыні. Мужчына здзівіўся, бо які прыём можа быць у суботу? Але яго супакоілі, што кіраўнік раёна ў курсе і ўжо чакае яго.

Без працы пакуль і Аксана Віктараўна з Магілёва, якая каля 30 гадоў займала розныя пасады, у тым ліку кіруючыя, у банкаўскай сферы. Ёй 48 гадоў, вышэйшая адукацыя, вопыт, але яе прафесіяналізм пакуль не запатрабаваны. Усё, што ёй прапаноўваюць на біржы працы — гэта... аператар ПЭВМ, повар або кандытар. Уладзімір Даманеўскі даручыў камітэту па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкама больш уважліва вывучыць становішча на рынку працы і прапанаваць жанчыне прымальныя варыянты.

Не менш актуальнай для жыхароў вобласці застаецца жыллёвая праблема. Шматдзетная сям'я з Бабруйска наогул трапіла ў нейкую дэтэктыўную гісторыю. Спачатку яе выключылі са спіса на трохпакаёўку з аздабленнем, а калі праз суд яна была адноўлена ў правах, кватэру вярнулі, але іншую, без аздаблення. Потым прыйшлося патрапаць нервы, каб паставіць нерухомасць на ўлік, бо ў афіцыйных дакументах кватэры наогул не было. Старшыня аблвыканкама паабяцаў дасканала разабрацца і перадаць адпаведны ліст у Генпракуратуру. Садзейнічанне ў атрыманні кватэры спатрэбілася яшчэ адной шматдзетнай сям'і з Бабруйска.

Жанчына з Магілёва паскардзілася, што яе сям'я набыла ўчастак для будаўніцтва жылля ў Казіміраўцы, але з-за адсутнасці дарогі і інжынерных сетак няма магчымасці зарэгістраваць дом, прыходзіцца плаціць за камунальныя паслугі па двайных тарыфах.

Фермер з Клімавіч паскардзіўся на тое, што ўчасціліся выпадкі, калі яму вяртаюць малако.

Жыхарка аграгарадка Свіслач Асіповіцкага раёна распрацавала план па стварэнні Цэнтра экалагічнай эстэтыкі на базе населенага пункта.

Прагучалі таксама пытанні, якія датычыліся несвоечасовых разлікаў за аказаныя паслугі, наконт дрэннага стану дарог у сельскай мясцовасці, адсутнасці тратуара, злоўжывання сваімі паўнамоцтвамі з боку кіраўніцтва гаражнага кааператыва, перабояў у працы водаправода, ігнаравання звароту старога чалавека наконт будаўніцтва навеса для дроў... Кожнаму, хто звяртаўся па дапамогу, будуць дадзены пісьмовыя тлумачэнні па пытаннях.

У гэты ж дзень 45 зваротаў паступіла ў Магілёўскі гарвыканкам, дзе прамую лінію вёў **мэр горада Уладзімір ЦУМАРАЎ**. З іх 29 датычыліся ЖКГ, гараджан таксама хвалявалі тэмы будаўніцтва жылля, аказання матэрыяльнай дапамогі, абрэзкі дрэў. Адзін чалавек звярнуўся па садзейнічанне ў працаўладкаванні, яшчэ адзін наконт вызвалення ад збору па Дэкрэце №3.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

**Сакратарыят Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні галоўнаму спецыялісту аддзела па забеспячэнні работы Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сакратарыята Савета Рэспублікі Нікіценка Вользе Генадзьеўне ў сувязі з вялікім горам, якое яе напаткала, — смерцю МАЦІ.**